Весці БДПУ. Серыя 1. 2018. № 2. С. 108–113.

# Літаратуразнаўства

*УДК 821.161.3 М. Гарэцкі*

## ЭСХАТАЛАГІЧНЫ МІФ У ТВОРАХ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

**Л. П. Леська,**
*старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ*

*UDC 821.161.3 M. Garetsky*

## ESCHATOLOGICAL MYTH IN THE WORKS OF MAKSIM GARETSKI

**L. Leska,**
*Senior Teacher of the Departament of Belarusian Literature and Culture, BSPU*

Паступіў у рэдакцыю 22.03.18.

Received on 22.03.18.

У артыкуле разглядаецца эсхаталагічны міф у творах М. Гарэцкага. У тэкстах пісьменніка выразна вылучаюцца рысы як усеагульнай, так і індывідуальнай эсхаталогіі.
Даследавана, што міфапаэтычнае ўвасабленне ўсеагульнай эсхаталогіі ў творах пісьменніка першапачаткова звязана з інтэрпрэтацыяй сусветнавядомых катастроф, да якіх адносіцца і біблейскі матыў пра патоп. У апавяданнях М. Гарэцкага гэты матыў знайшоў адлюстраванне ў гісторыях пра затапленне гарадоў. Праявай ўсеагульнай эсхаталогіі ў трактоўцы беларускага класіка стаў паказ узрастання пачуцця трывогі і смутку, збяднення веры, з’яўлення ілжэпрарокаў і антыхрыстаў, богаборцаў.

*Ключавыя словы:* беларуская літаратура пачатку XX ст., міф, міфапаэтычная трансфармацыя, эсхаталагічны міф, усеагульная эсхаталогія, індывідуальная эсхаталогія, богаборніцтва.

The article considers the eschatological myth in M. Garetski's works. Features of both universal and individual eschatology are clearly distunguished in the writer's texts.
It was concluded that the mythopoetical embodiment of universal eschatology in the writer's works was originally associated with the interpretation of world-famous catastrophes, which include the Biblical motif of the Flood. In M. Garetski's stories, this motif is reflected in the narrations about the flooding of the cities.
The next manifestation of universal eschatology in the interpretation of the Belarusian classical author was the display of growing feelings of anxiety and sadness, the impoverishment of faith, the appearance of false prophets, antichrists, theomachists.

*Keywords:* Belarusian literature of the early 20th century, myth, mythopoetical transformation, eschatological myth, universal eschatology, individual eschatology, theomachy.

Адной з характэрных асаблівасцей беларускай літаратуры пачатку XX ст. стала ўзмацненне міфатворчага імпульса.

Сярод прычын павышанай цікавасці пісьменнікаў да міфа айчынныя навукоўцы (М. Тычына, І. Чыгрын, Л. Корань, Т. Шамякіна, У. Конан, Е. Лявонава, Г. Друк) называюць разбурэнне базавых анталагічных і эпістэмалагічных уяўленняў, узмацненне ідэалагізацыі грамадскай свядомасці, пошукі апоры ў традыцыйных вобразах і арыенцірах.

М. Гарэцкі адлюстраваў складаную сітуацыю ў грамадстве і ў жыцці чалавека праз апісанне эсхаталагічных поглядаў і перакананняў асобных персанажаў, іх псіхалогіі, якая афармілася не толькі пад уплывам хрысціянскіх пытанняў пра боскі суд, пра пераадоленне смерці, але і пад цяжарам глабальных катастроф эпохі.

Гіпатэтычным для нашага артыкула стала меркаванне, што класік беларускай літаратуры ўзнаўляе міфакомплекс з яго эсхаталагічнай дэкларацыяй канца Старога свету і касмацэнтрычнай установкай стварэння новага. Ядром міфалагічнай структуры ў прозе класіка беларускай літаратуры становіцца сінтэз касмаганічнай і эсхаталагічнай мадэляў, міфалагічных комплексаў пра стварэнне і гібель свету.

Задача дадзенай працы заключаецца ў асэнсаванні міфолага-эсхаталагічнага светабачання, у апісанні асноўных эсхаталагічных вобразаў і апакаліптычных сімвалаў у творах М. Гарэцкага.

У гэтым даследаванні мы не разгледзім багаслоўскую эсхаталогію[1], (у поўным значэнні гэтага выразу) як цэласнай сістэмы,

[1] Багаслоўская эсхаталогія, згодна з біблейскімі слоўнікамі і энцыклапедыямі, – гэта *«вучэнне пра апошнія падзеі і аб тым, што будзе ў канцы».* (Никифор, Архимандрит. Популярная библейская энциклопедия / Архимандрит Никифор. – М. : Вече, 2002. – 656 с.)

таму што ў літаратурнай творчасці пісьменніка такая цэласнасць і завершанасць (у тэасофскім значэнні) адсутнічае. Безумоўна, мы будзем звяртацца да вызначэння эсхаталогіі як *«рэлігійнага вучэнння пра канец свету (у часе і прасторы)»* [1, с. 503], і ўлічым удакладненні С. Аверынцава, які падкрэсліваў, што ў хрысціянскай традыцыі заўсёды адрознівалі *«індывідуальную эсхаталогію, або, вучэнне пра замагільнае жыццё адзінкавай чалавечай душы, і сусветную (універсальную) эсхаталогію – вучэнне пра мэты космасу і гісторыі, пра вычэрпванне імі свайго сэнсу, пра іх канец і што за гэтым канцом пачнецца* [2, с. 582].

Эсхаталагічныя матывы і вобразы ў аўтарскім міфалагізаванні класіка беларускай літаратуры не сталі прадметам асобнага даследавання ў сучаснай навуцы, хаця першыя грунтоўныя падыходы да іх асэнсавання былі зроблены ў працах Д. Бугаёва, М. Тычыны, І. Чыгрына, У. Конана.

Мастацкая эсхаталогія пісьменніка – гэта сінтэз міфалогіі, філасофіі і тэасофіі, дзе прасочваюцца рысы як індывідуальнай, так і ўсеагульнай эсхаталогіі. М. Гарэцкі звярнуўся да набыткаў сусветнай і славянскай міфалогіі, біблейскіх тэкстаў, прамым доказам гэтага стаў змястоўны «Паказальнік біблейскіх архетыпаў, міфалагічных вобразаў і матываў у творчасці Максіма Гарэцкага», змешчаны ў артыкуле У. Конана, які пачынаецца тлумачэннем біблейскага вобраза антыхрыста: *«Антыхрыст у хрысціянскай тэалогіі – антаганіст Ісуса Хрыста, які будзе цараваць у канцы гістарычнага часу, узначаліць барацьбу супраць хрысціянства, але будзе пераможаны»* [3, с. 8].

Наяўнасць вобраза антыхрыста, побач з багаборчымі, або багаборніцкімі матывамі і вобразамі – яскравае сведчанне эсхаталагічнага светаадчування эпохі, перададзенага ў творах М. Гарэцкага.

«Багаборніцтва як дзейнасць богаадступнікаў»[1] стала адметным аспектам аўтарскага міфалагізму, прыкметы якога ў творах М. Гарэцкага заўважылі Д. Бугаёў, І. Чыгрын.

Д. Бугаёў, зыходзячы з патрабаванняў і ідэалагічных установак свайго часу, лічыў цікавым характарам Гаўрылу Пячкура (апавяданне «Страхаццё»), які вылучаецца *«перш за ўсё тым жыватворным скептыцызмам, які ва ўсе часы быў уласцівы самасвядомасці людзей працы і нейк ураўнаважваў, нейтралізаваў забабоннасць пэўных пластоў народа, асабліва сялянства, абмяжоўваў яе…?»* [4, с. 71]. Вучоны ўсхваляў жыццёвую практычнасць і разважлівасць героя М. Гарэцкага, яго імкненне парушыць усталяваныя правілы і нормы, яго жаданне не пагаджацца з таямнічымі забабонамі. Свядомае бунтарства Гаўрылы Пячкура, магчыма, і стала пярэдаднем багаборніцтва Антона Жабона (драматызаваная аповесць «Антон»), пра дзіўны характар якога ў свой час пісаў Дзмірый Бугаёў, звярнуўшы ўвагу на красамоўны партрэт Антона: *«Яшчэ малады, русавалосы, з невялікаю барадою, з глыбокімі вачыма, паглядам падобен на Хрыста на абразах…»* [4, с. 85].

Партрэт героя ўбірае ў сябе алюзійныя намёкі на шырока распаўсюджанае ў багаслоўскай эсхаталогіі другое прышэсце Ісуса Хрыста, які і павінен здзейсніць справядлівы суд. І калі ў часы Д. Бугаёва не заахвочвалася глыбокае вывучэнне інтэрпрэтацый біблейскіх тэкстаў у літаратурнай творчасці М. Гарэцкага, то ў даследаваннях У. Конана, Е. Лявонавай, М. Мушынскага[2] гэты аспект эсхаталагічнага міфалагізавання пісьменніка быў шырока раскрыты на прыкладзе драматызаванай аповесці «Антон».

М. Мушынскі палічыў забойства, здзейсненае Антонам, «ахвярапрынашэннем Богу за бацькавы грахі» [5, с. 91]. Прычына цяжкага становішча героя М. Гарэцкага тлумачыцца тым, што ён, паводле тлумачэння У. Конана, – «за сімволікай абрадаў і фрагментамі святога пісання не змог разгледзець выратавальную сілу любові ў хрысціянстве, а пагэтаму не мог паўплываць на свайго бацьку ў стане богапакінутасці» [6, с. 91]. А ў фінале Антон *«спатыкнуўся на старазапавецкім, па сутнасці язычніцкім уяўленні таемнасці выратавання людзей праз самаахвярапрынашэнне Сына Божага»* [6, с. 91].

Вобраз богапакінутага Антона па сваім светаўладкаванні блізкі герою апавядання

---

[1] *Завальнюк, У. М.* Энцыклапедычны слоўнік рэлігійнай лексікі беларускай мовы / У. М. Завальнюк, М. Р. Прыгодзіч, В. К. Раманцэвіч. – Мінск : Издательство Гревцова, 2013. – 804 с.

[2] *Конан, У. М.* Міфалагічныя і біблейскія вобразы і матывы ў творчасці Максіма Гарэцкага / У. Конан // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць : XVIII Гарэцкія чытанні : матэрыялы чытанняў, Мінск, 9 крас. 2009 г. (прысвячаюцца году роднай зямлі.) – Мінск, 2009. – С. 131–142. ; *Лявонава, Е. А.* Семантыка метамарфозы ў апавяданні М. Гарэцкага «Рускі» і навеле Ф. Кафкі «Ператварэнне»: агульнае і асаблівае / Е. А. Лявонава // Немецкая культура в контексте мировой : сб науч. ст. / под ред. Г. В. Синило; Белорус. гос ун-т. – Минск : РИВШ, 2014. – 324 с. ; *Мушынскі, М. І.* Максім Гарэцкі / М. І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя. У 4-х т. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – Т. 1. – С. 381–426.

«Рускі». Гэты твор, па словах Е. Лявонавай, вылучаецца *«багатым алюзійным патэнцыялам. Тут прыгадваецца алюзія на забойства Авеля, ён забіты, але, Бог чуе яго “голас крыві” і абрынае ў прадонне самога забойцу, Каіна, апошні, забіўшы брата, забівае і сябе, паводле знаўцы Старога Запавету*[1]*, – “містычна ўсе людзі ёсць нібы адзін чалавек… той, хто губіць блізкага свайго, губіць самога сябе»* [7, с. 97].

Такім чынам, У. Конан, Е Лявонава дакладна ўбачылі алюзіі на біблейскія гісторыі ў эсхаталагічным міфе М. Гарэцкага. У аўтарскіх трансфармацыях біблейскіх аповедаў пра канец свету вучоныя не толькі заўважылі прыкметы сусветнай эсхаталогіі ў творах класіка беларускай літаратуры, але і абазначылі яе аптымістычны характар. Побач з такімі жыццесцвярджальнымі бачаннямі эсхаталогіі, у беларускай навуцы сфарміраваўся і песімістычны погляд на эсхаталагічны міф М. Гарэцкага. М. Тычына ў артыкуле «На выспе патмас» слушна падкрэсліў, што *«ў поглядзе на нацыянальную рэчаіснасць і на будучыню беларускага Адраджэння Максім Гарэцкі быў песімістычным аптымістам»* [8, с. 17]. Гэта было абумоўлена тым, што ва ўмовах агульнаеўрапейскага крызісу ўзрасла пагроза нацыянальнага заняпаду. М. Гарэцкі, па словах літаратуразнаўцы, – здолеў убачыць знакі *«духоўнага выраджэння нацыі, якая апынулася ў невыносных умовах забароны ўсяго беларускага»* [8, с. 17].

Сутнасць такога бачання, на думку вучонага, – схавана *«ў глыбінных з’явах, якія адбываюцца ў беларускай гісторыі і адлюстроўваюцца ў нацыянальным характары»* [8, с. 17]. З такой жа высновай верагодна пагаджаецца і В. Уткевіч, адзначаючы, што М. Гарэцкі *«намагаўся глыбей увайсці ў свет той міфалогіі, якая захавалася ў душы беларускага селяніна, у загадкавае патаемнае»* [9, с. 10].

Патаёмнае М. Гарэцкага ў асэнсаванні В. Уткевіч, – гэта цэласная сістэма, якая зводзіцца не толькі да забабонаў (хоць безумоўна звязана з імі), а ўяўляе сабой *«своеасаблівую якасную цэласнасць, якая ёсць вынік арганічнага сінтэзу рэлігіі, міфалогіі і фальклору»* [9, с. 10]. «Патаёмнае» ў М. Гарэцкага фіксуе асаблівы эмацыянальны, псіхалагічны настрой героя. І часта гэта настрой *«нявызначанасці, трывогі, звязанай з жаданнем аўтара паказаць загадкавую, складаную прыроду чалавечай душы»* [9, с. 10].

Адметны настрой герояў М. Гарэцкага, іх характар, зыходзячы з тлумачэнняў А. Адамовіча, М. Тычыны, В. Уткевіч, сталі асновай як нацыянальнай, так і індывідуальнай эсхаталогіі.

Яшчэ ў дваццатыя гады мінулага стагоддзя А. Адамовіч вызначыў групу твораў класіка беларускай літаратуры, якія закранаюць так званыя *«касмагонічна-гнасэалагічныя, вядомыя пад назваю праклятых пытанняў»* [10, с. 39]. Крытык звярнуў увагу на аспекты эсхаталагічнага ў творах М. Гарэцкага, адзначыўшы, што *«ў апавяданні “У лазні” пераважае паглыблены “псіхалагізм, трагедыйнасць, “двудушша” і “песымізм”»* [10, с. 42].

Адметныя рысы светаадчування герояў М. Гарэцкага, дакладна вызначаныя А. Адамовічам, з’яўляюцца ключавымі ў літаратурнай эсхаталогіі, зыходзячы з сучасных метадалагічных распрацовак,. У прыватнасці, расійская даследчыца В. Арлова ў працы. «Эсхатологические мотивы в творчестве М. А. Булгакова (на материале романов “Белая гвардия” и “Мастер и Маргарита”)» адзначыла, што: *«сітуацыя канца свету, Апакаліпсісу, сусветнай катастрофы, крызіса, і нават гібелі вечных каштоўнасцей з’яўляецца не толькі касмічнай, а … духоўна-псіхалагічнай падзеяй, г. зн. усеагульны апакаліпсіс пачынаецца з таго, які перажывае кожны чалавек ўнутры сябе, на ўзроўні індывідуальнага самаадчування і светасузірання і які, так, або інакш, з’яўляецца адлюстраваннем эсхаталагічных чаканняў таго, або іншага народа, этнаса, краіны, грамадства»* [11, с. 9].

Высновы сучасных эсхатолагаў сугучныя з перакананнямі Антона Адамовіча, які яшчэ напачатку ХХ ст. заўважыў, што найбольш абвострана крытычныя сітуацыі ў грамадскім жыцці краіны «перажываюць *“псіхічна-хворыя”»* [10, с. 43] героі М. Гарэцкага. Герой апавядання «Рунь», як падкрэсліў даследчык, – *«адчувае і ўсведамляе сваю псіхічную хваробу, якая ледзь не даводзіць яго да самагубства, гераіня апавядання “Красаваў язьмін” проста сама заяўляе: “Я – ненармальная, рэзка-ненармальнай псіхалогіяй надзелены персанажы з апавядання “Што яно”»* [10, с. 43].

Такім чынам, вывучэнне навуковых прац па праблеме эсхаталагічнага міфа М. Гарэц-

---

[1] *Щедровицкий, Д. В.* Введение в ветхий Завет : в 8 т. : Книга Бытия / Д. В. Щедровицкий. – М. : «Оклик», 1994. – Т. 1. – 1088 с.

кага дае падставу адзначыць, што ў творах пісьменніка беларускія вучоныя вылучаюццъ дзве, умоўна вызначаныя сучаснай навукай, эсхаталогіі: сусветную і індывідуальную. Праявы ***сусветнай эсхаталогіі*** дакладна вызначаны У. Конанам, Е. Лявонавай, адметнасць ***індывідуальнай эсхаталогіі*** падкрэсліваецца ў метадалагічных распрацоўках Антона Адамовіча, М. Тычыны, В. Уткевіч.

Мы ў сваю чаргу схіляемся да думкі, што ў міфалагізме М. Гарэцкага прасочваецца пераход ад адлюстравання праяў сусветнай (агульнай эсхаталогіі) да апісання пэўных аспектаў і характарыстык індывідуальнай.

Праявамі сусветнай эсхаталогіі ў мастацкіх тэкстах М. Гарэцкага стала апісанне сусветных катастроф, тыпу патопа[1]. Фрагмент затаплення горада па прычыне яго вялікай грахоўнасці пададзены ў апавяданні «Роднае карэнне», пра што і апавядае Архіпу Лінкевічу балагольшчык: *«Паніч, – загаварыў з нейкім жахам, вы, мусіць, ведаеце, што ў гэтым балоце, што налева, калісь-то ў даўныя гады цэлы горад за нешто праваліўся скрозь-донния. У ноч купальскую чутны званы падземныя, а каля кургана, дзе манастыр быў даўней, іншыя чулі, як манахі ў скляпах абедню правяць….»* [12, с. 63]. Грунтоўныя прычыны тых дзіўных метамарфоз, што здарыліся з горадам, апавядальнік не называе, але акцэнтуе ўвагу чытача на наступствах, якія сталі адбывацца пазней. Гэта і гук званоў, і жыццё падземнага горада. Усе гэтыя праявы сведчаць, што будзе другое прышэсце, адбудзецца справядлівы Божы суд, падчас якога паўстануць памерлыя і адкажуць за свае грахі. Згодна, з тлумачэннямі С. Мароз[2], у новазапаветнай эсхаталогіі падавалася ўяўленне пра двайное ўваскрэсенне. Першае ўваскрэсенне праведнікаў было напачатку тысячагадовага царства, – сёмага тысячагоддзя, сёмага касмічнага дня, Суботы Гасподняй, якой заканчваецца гісторыя; і другі суд, і другое ўсеагульнае ўваскрэсенне, за якім пачнецца вечная асалода, задавальненне праведных і вечная мука асуджаных – канец, мэта касмічнага працэсу.

У апавяданні «Лірныя спевы» героі М. Гарэцкага знаходзяцца ў чаканні другога суда, асабліва пакутным гэтае чаканне стала для князёўны Ганны Саламярэцкай. Яна здрадзіла Радзіме, уступіла ў змову з польскім княжычам Уладыславам Ваябойскім, аддала сваю родную старонку Маскоўшчыне, здрадзіла сваім падданым і веры праваслаўнай. За гэты ўчынак мніх Грыгоры пракляў адступніцу: *«– Божа наш! – крыкнуў ён. – Судзі нас, судзі мяне… Канец нам. Наша княжна пакінула нас, сплутала з Польшчаю і Маскве аддала. Вун склычыліся ў бягні валасы яе, дык ніхай жа расклычыць іх … Задрыжэла зямля, полымя шуганула са ўсіх бакоў, пад грукат гармат і стогны байцоў шухнула ўсё аж на мілю кругом у зямлю наскрозьдоння…»* [12, с. 49]. (Пасмяротныя пакуты Ганны Саламярэцкай усяляюць у душы вернікаў трывогу і жах у чаканні Страшнага Божага суда.)

Тыя далёкія падзеі, узноўленыя ў апавяданні «Лірныя спевы» М. Гарэцкага, паказвалі, што свет ідзе да свайго канца. Прыкметамі надыходу апакаліптычнай сітуацыі сталі адыход ад Бога, збядненне веры, прыход антыхрыста і ілжэпрарока, несправядлівыя войны, пажары, пастаяннае ўзрастанне пачуцця трывогі, распаўсюджванне маральнай распушчанасці і блуду.

Праблема веры, рэлігійныя пытанні ў творах класіка беларускай літаратуры шырока асвятляліся ў працах айчынных навукоўцаў[3]. З. Драздова пісала: *«Беларускую нацыянальную прозу заўсёды займала пытанне: "У што верыць беларус?…" Моцна хвалявала гэта пытанне і пісьменніка класіка М. Гарэцкага»* [13, с. 81].

[1] Пра патоп як класічны эсхаталагічны прыклад знаходзім дакладныя звесткі ў даследаванні Т. І. Шамякінай : *Шамякина, Т. И.* Эсхаталогия (Мифы о Потопе) : учеб. пособие для самостоятельной работы студентов филологического факультета БГУ по курсам «Славянская мифология», «Восточная мифология» / Т. И Шамякина. – Минск : РИВШ, 2002. – 65 с.

[2] *Мороз, С. В.* Текст Откровения Иоанна Богослова в произведениях Ф. М. Достоевского : автореф. дис. … канд. филол. наук. ; 10.01.08 – Теория литературы: Моск. гор. пед. ун-т / С. В. Мороз. – Москва, 2004 – 17 с.

[3] *Бугаёў, Д. Я.* Максім Гарэцкі / Д. Бугаёў. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – 239 с., *Мушынскі, М.* Падзвіжнік з Малой багацькаўкі. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага / М. Мушынскі. – Мінск : Беларуская навука, 2008, *Кажамякін, Г. В.* Максім Гарэцкі і біблія / Г. В. Кажамякін // Гарэцкія чытанні : матэрыялы дакл. і паведамл. На Сёмых чытаннях, Мінск, 2–3 чэрвеня. 1998, Восьмых чытаннях, Пінск, 16–18 чэрвеня 1999, Дзявятых чытаннях 8–9 чэрвеня 2000, Дзясятых чытаннях, Мінск, 2001 / Дзяржаўны музей беларускай літаратуры – Мінск, 2002. С. 330–334., *Драздова, З.* Рэлігійная тэматыка ў творчасці Максіма Гарэцкага / З. Драздова // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (да 120 годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага). Матэрыялы XXII Гарэцкіх чытанняў. – Мінск, 2013. – 242 с., *Ярмоленка, А. У.* Хрысціянскія і язычніцкія традыцыі ў творчасці Максіма Гарэцкага / А. Ярмоленка // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре Министерство образования Республики Беларусь. Учреждение образования «Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины». – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2009. – С. 114–116.

У жыцці і творчасці М. Гарэцкага, як слушна заўважыў М. Кенька, – *«можна прасачыць пастаянныя пошукі духоўнага апірышча чалавека, дзеля чаго варта і трэба жыць. <…> І ў гэтых пошуках паняцце веры, як ідэі сэнсу жыцця і прызнанне, што гэтым сэнсам апякуюцца і звышнатуральныя сілы, непадуладныя чалавечаму розуму, то ідуць паралельна, то сыходзяцца. У ранніх апавяданнях М. Гарэцкага "Патаёмнае", "Роднае карэнне", "Што яно", "Страхаццё" ёсць спроба разабрацца ў тым, у што верыць, як разумее сэнс свайго жыцця вясковы чалавек-селянін»* [14, с. 68].

Пагаджаючыся з перакананнямі нашых папярэднікаў па праблеме рэлігійнага самавызначэння М. Гарэцкага і беларусаў наогул, мы ў сваёй працы атаясамліваем пытанне збяднення веры з пярэдаднем эсхаталагічнай сітуацыі, якая складвалася паступова. Напачатку аўтар паказаў, што ў народным светапоглядзе гарманічна суіснуюць язычніцкія і хрысціянскія каштоўнасці. У апавяданні «Роднае карэнне» М. Гарэцкі прыгадвае, што Архіп Лінкевіч быў выліты дзед, які да самай смерці маліўся Богу, але пры гэтым ён не забываў лашчыць лесавых, вадзяных, дамавых. У гэтым жа творы прыводзяцца звесткі, што Нупрэй Лінкевіч нават пасвяціў сваю новую хату, каб там зло не тварылася.

Такім чынам, у мастацкім міфалагізаванні М. Гарэцкага побач з гарманічным двуадзінствам хрысціянскай аксіялогіі і язычніцкіх каштоўнасцей у аўтарскім міфалагізаванні ўзрастае антыхрысціянскі нігілізм у такіх яго розных формах, як паступовай страце веры ў Бога, веры ў вечнажывую душу, а таксама ва ўзмацненні часовай веры ў пераканальную і пераможную сілу навукі.

*Літаратура*


1. Христианство : Словарь / В. П. Андронова [и др.] ; под общ. ред. Л. Н. Митрохина [и др.]. – М. : Республика, 1994. – 559 с.
2. Философская энциклопедия : в 5 т. – М. : Советская энциклопедия, 1970. – Т. 5. – С. 580–582.
3. *Конан, У. М.* Міфалагічныя і біблейскія вобразы і матывы ў творчасці Максіма Гарэцкага / У. М. Конан // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць : XVII Гарэцкія чытанні : матэрыялы чытанняў, Мінск, 9 красавіка 2009 г. (прысвячаюцца году роднай зямлі.) – Мінск, 2009. – С. 131–142.
4. *Бугаёў, Д. Я.* Максім Гарэцкі / Д. Я. Бугаёў – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 161 с.
5. *Мушынскі, М. І.* Максім Гарэцкі / М. І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4 т. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – Т. 1. – С. 381–426.
6. *Конан, У. М.* Матывы спакусы ў творчасці Максіма Гарэцкага: Аповесць «Антон» / У. М. Конан // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць. Матэрыялы XVI Гарэцкіх чытанняў (да 115-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага). Мінск, 15 лютага 2008 г. / Калектыў аўтараў. – Мінск, 2008. – 154 с.
7. *Лявонава, Е. А.* Семантыка метамарфозы ў апавяданні М. Гарэцкага «Рускі» і навеле Ф. Кафкі «Ператварэнне» агульнае і асаблівае / Е. А. Лявонава // Немецкая культура в контексте мировой: сб. науч. ст. / под ред Г. В. Синило ; Белорус. гос. универ. – Минск : РИВШ, 2014. – 324 с
8. *Тычына, М.* На выспе патмас / М. Тычына // Роднае слова. – 1993 – № 2. – С. 15–18.
9. *Уткевіч, В. І.* Тыпалогія нацыянальнага характару творчасці Кнута Гамсуна і Максіма Гарэцкага / В. І. Уткевіч. – Мінск : Бестпрынт, 2012. – 124 с.
10. *Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускае літаратуры / А. Адамовіч. – Мінск : Выдавец І. П. Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.
11. *Орлова, О. А.* Эсхатологические мотивы в творчестве М. А. Булгакова (на материале романов «Белая гвар-


*References*


1. Khristianstvo : Slovar / V. P. Andronova [i dr.] ; pod obshch. red. L. N. Mitrokhina [i dr.]. – M. : Respublika, 1994. – 559 s.
2. Filosofskaya entsiklopediya : v 5 t. – M. : Sovetskaya entsiklopediya, 1970. – T. 5. – S. 580–582.
3. *Konan, U. M.* Mifalagichnyya i bibleyskiya vobrazy i matyvy u tvorchastsi Maksima Garetskaga / U. M. Konan // Maksim i Gauryla Garetskiya. Zhyttsyo i tvorchasts : XVII Garetskiya chytanni : materyyaly chytannyau, Minsk, 9 krasavika 2009 g. (prysvyachayuttsa godu rodnay zyamli). – Minsk, 2009. – S. 131–142.
4. *Bugayou, D. Ya.* Maksim Garetski / D. Ya. Bugayou. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1968. – 161 s.
5. *Mushynski, M. I.* Maksim Garetski / M. I. Mushynski // Gistoryya belaruskay litaratury XX stagoddzya. U 4-kh t. – Minsk : Belaruskaya navuka, 1999. – T. 1. – S. 381–426.
6. *Konan, U. M.* Matyvy spakusy u tvorchastsi Maksima Garetskaga: Apovests "Anton" / U. M. Konan // Maksim i Gauryla Garetskiya. Zhyttsyo i tvorchasts. Materyyaly XVI Garetskikh chytannyau (da 115-goddzya z dnya naradzhennya Maksima Garetskaga). Minsk, 15 lyutaga 2008 g. / Kalektyu autarau. – Minsk, 2008. – 154 s.
7. *Lyavonava, Ye. A.* Semantyka metamarfozy u apavyadanni M. Garetskaga "Ruski" i navele F. Kafki "Peratvarenne" agulnaye i asablivaye / Ye. A. Lyavonava // Nemetskaya kultura v kontekste mirovoy: sb. nauch. st. / pod red. G. V. Sinilo ; Belorus. gos. univer. – Minsk : RIVSh, 2014. – 324 s.
8. *Tychyna, M.* Na vyspe patmas / M. Tychyna // Rodnaye slova. – 1993 – № 2. – S. 15–18.
9. *Utkevich, V. I.* Typalogiya natsyyanalnaga kharaktaru tvorchastsi Knuta Gamsuna i Maksima Garetskaga / V. I. Utkevich. – Minsk : Bestprynt, 2012. – 124 s.
10. *Adamovich, A.* Da gistoryi belaruskaye litaratury / A. Adamovich. – Minsk : Vydavets I. P. Zmitser Kolas, 2005. – 1464 s.
11. *Orlova, O. A.* Eskhatologicheskiye motivy v tvorchestve M. A. bulgakova (na materiale Romanov "Belaya

дия» и «Мастер и Маргарита»): автореф. дис. … канд. филолог. наук: 10.01.01 / О. А. Орлова. – Мос. гор. пед ун-т. – М., 2008 – 28 с.
12. *Гарэцкі, М.* Выбраныя творы / М. Гарэцкі ; уклад. Р. Гарэцкі. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 640 с.
13. *Драздова, З.* Рэлігійная тэматыка ў творчасці Максіма Гарэцкага / З. Драздова // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (да 120 годдзя з дня нараджэння Масксіма Гарэцкага): матэрыялы XXI Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 15 лютага 2013 г.; Калектыў аўтараў. – Мінск, 2013. – 242 с.
14. *Кенька, М.* Максім Гарэцкі і вера / М. Кенька // Гарэцкія чытанні : матэрыялы дакладаў і паведамл. 6 чытанняў, Горкі, 18–20 чэрв. 1997 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ. – Мінск, 2000. – С. 66–70.

gvardiya" i "Master i Margarita"): avtoref. dis. … kand. filol. nauk: 10.01.01 / O. A. Orlova. – Mos. gos. ped. un-t. – M., 2008. – 28 s.
12. *Garetski, M.* Vybranyya tvory / M. Garetski ; uklad. R. Garetski. – Minsk : Knigazbor, 2009. – 640 s.
13. *Drazdova, Z.* Religiynaya tematyka u tvorchastsi Maksima Garetskaga / Z. Drazdova // Maksim i Gauryla Garetskiya. Zhyttsyo i tvorchasts (da 120-goddzya z dnya naradzhennya Maksima Garetskaga): materyyaly XXI Garetskikh chytannyau, Minsk, 15 lyutaga 2013 g.; Kalektyu autarau. – Minsk, 2013. – 242 s.
14. *Kenka, M.* Maksim Garetski i vera / M. Kenka // Garetskiyya chytanni : materyyaly dakladau i pavedaml. 6 chytannya, Gorki, 18-20 cherv. 1997 g. / Dzyarzh. muzey gistoryi bel. lit. – Minsk, 2000. – S. 66–70.